3.Рукина Т.В.Использование информационно-коммуникативных технологий в экологическом образовании школьников// [Электронный ресурс] /[Режим доступа: http:// ito.su›1999/ii/4/466.html]
4.Полунин А. В.Услуги видеоконференцсвязи: вчера, сегодня, завтра.// [Электронный ресурс] /[Режим доступа: http://www.linkc.ru/]

## ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**С. М. Грыцук, настаўнік**
*ДУА "Сярэдняя школа № 9 г. Пінска", г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

Бедны той, хто не мае скарбаў вечных, скарбаў душы, такі скарб, які ніхто і ніколі адабраць ад нас не здолее, – гэта любоў да Бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы.

Цётка

Гэтыя прарочыя словы Цёткі, сказаныя больш чым стагоддзе назад, актуальныя і ў цяперашні час, калі мы бачым, што чалавек, наш вучань, акунаецца ў цемру нянавісці і злосці, абыякавасці і раўнадушша, духоўна бяднее, а калі ў душы адсутнічае любоў да бліжняга, да маці і бацькі, да роднай краіны, мовы, калі ён не памятае, не ведае гісторыі сваёй зямлі – такі чалавек губляе будучыню.

Дык вось, каб глядзець смела ў заўтрашні дзень, у будучыню, трэба берагчы сваё мінулае, як самы дарагі скарб. Трэба нам, настаўнікам, расказваць і паказваць, разам з вучнямі даследаваць, весці пошукавую работу, шукаць адказы на многія пытанні ў нашых продкаў, у нашай багатай шматвекавой гісторыі. І гэта праца з'яўляецца галоўным ключом у патрыятычным і нацыянальным выхаванні вучняў на ўроках роднай літаратуры.

Патрыятызм (ад грэч. patris – айчына, радзіма) – шырокае і глыбокае пачуццё любові да сваёй Радзімы, да сваёй Айчыны, гатоўнасць падпарадкаваць свае асабістыя і групавыя інтарэсы агульным інтарэсам краіны, верна служыць ёй і абараняць яе.

Галоўная мэта сістэмы адукацыі любой краіны – фарміраванне грамадзяніна-патрыёта. Без гэтага немагчыма існаванне самой дзяржавы. Нашай дзяржаве вельмі патрэбны не толькі добра падрыхтаваныя спецыялісты, але і патрыёты сваёй Радзімы, свядомыя грамадзяне.

Патрыятычнае выхаванне дапамагае чалавеку вызначыцца, хто ён, грамадзянінам якой дзяржавы з’яўляецца, якія задачы ставіць у жыцці. Галоўная мэта сапраўднага патрыятычнага выхавання – фарміраванне асобы, якая будзе імкнуцца да самарэалізацыі і паляпшэння свайго дабрабыту як складовай часткі дабрабыту сваёй Бацькаўшчыны. Толькі ў такім выпадку ідэі патрыятычнага выхавання будуць садзейнічаць вырашэнню агульнанацыянальных задач.

Праблема фарміравання ідэалогіі навучання і выхавання не новая. Настаўнікі заўсёды аддавалі шмат увагі выхаваўчаму аспекту. Справа ў тым, што сёння істотна пашырыўся інфармацыйны паток, які значна ўплывае на гэтую праблему. Яна набыла на сучасным этапе асаблівае гучанне, бо разбураюцца папярэднія ідэалы, а новыя не паспяваюць сфарміравацца.

Як жа праблема патрыятычнага і нацыянальнага выхавання як асноўнага аспекта фарміравання дзяржаўнай ідэалогіі вырашаецца мною на ўроках літаратуры?

Рашаючы праблему грамадзянскага выхавання вучняў, я на першы план стаўлю выхаванне падлеткаў, якія змогуць паспяхова выконваць свой грамадзянскі абавязак, гэта значыць паважаць дзяржаўную ўладу, імкнуцца да міру, любіць Радзіму, праяўляць патрыятызм, гэта пачуццё ўласнай годнасці, дысцыплінаванасць, культура міжнацыянальных адносін.

Галоўнай задачай прадмета з’яўляецца фарміраванне творчай асобы, развіццё пачуцця любві да роднай зямлі, яе прыродных багаццяў, павагі да

гісторыі і культуры сваёй Радзімы. Грамадзянскае выхаванне пачынаецца з выхавання любові да роднага куточка – радзімы, дзе праходзіць дзяцінства. На сваіх уроках мы разам з вучнямі адпраўляемся ў падарожжа па знаёмых з дзяцінства мясцінах. З гэтай мэтай выкарыстоўваем тэксты, малюнкі, ілюстрацыі, фотаздымкі, мультымедыя, відэа. Дзеці маюць магчымасць яшчэ раз угледзецца ў абрысы роднай зямлі, адзначыць, што мясціны, у якіх яны жывуць, зусім непадобныя на другія.

Праграма па літаратуры надзвычай багатая на творы, прыдатныя для патрыятычнага выхавання. Багаты матэрыял дае раздзел "Мой чароўны беларускі край…" (V клас), які пачынаецца вывучэннем верша П.Броўкі "Калі ласка". Мэта ўрока – паказаць трапнасць і выразнасць беларускай мовы, высокія маральныя якасці беларускага нацыянальнага характару – гасціннасць, добразычлівасць, спагадлівасць і гэтак далей. Не можа пакінуць раўнадушным верш "Бацькаўшчына" У.Караткевіча, дзе вучні могуць спазнаць карціны прыроды нашай зямлі, убачыць яе краявіды, захапляцца яе маляўнічасцю. Да заключнага ўрока па раздзеле вучні рыхтуюць вусныя выказванні пра наш край, беларускую мову, яе прыроду на аснове вывучаных твораў. У выказваннях вучняў і любоў да роднага краю, і захапленне яго краявідамі, і гонар за шчасце жыць на роднай зямлі. Вялікае выхаваўчае значэнне мае раздзел "За смугою стагоддзяў" (V  клас). Цікава праходзіць у V класе абагульняючы ўрок "Скарбы роднага краю" па дадзеным раздзеле . Вучні, адгадваючы загадкі, аналізуючы прымаўкі і прыказкі, вучацца на такіх уроках  любіць радзіму, шанаваць сваю працу, адчуваць адказнасць за мову, на якой гавораць, клапаціцца пра інтарэсы Бацькаўшчыны.

Нельга стаць сапраўдным патрыётам сваёй Радзімы, калі ты не ведаеш народных звычаяў, свят, абрадаў беларускага народа. Таму вучням да ўрокаў па гэтых тэмах рэкамендуем наведаць краязнаўчы музей, дзе на свае вочы яны могуць пазнаёміцца з вышыванымі ручнікамі, сурвэткамі, посудам нашых продкаў. А ўжо на аснове тэкстаў вучым дзяцей помніць месца, дзе ты нарадзіўся, дзе жывуць твае бацькі. Паступова вучні прыходзяць да высновы,

што ў кожнага чалавека ёсць свая маленькая радзіма, і дзе б ты ні быў, трэба заўсёды варочацца сюды.

Урокі беларускай літаратуры па тэмах: “В.Быкаў “Жураўліны крык”: Вытокі подзвігу і здрады герояў аповесці” (VIII клас), “Р.Барадулін “Трэба дома бываць часцей”: Любоў чалавека да родных мясцін і блізкіх людзей – адзнака яго патрыятызму і духоўнасці” (VIII клас), “Памяць мінулай вайны…” (Па апавяданнях І.Чыгрынава) (XI клас), “Свет Радзімы-Беларусі ў лірыцы Рыгора Барадуліна” (XI клас), “Малая радзіма, казачная палеская прырода ў светлых колерах у лірыцы Я.Янішчыц” (IX клас), “Выкрыццё жорсткасці, бесчалавечнасці фашызму ў аповесці В.Быкава “Знак бяды” (XI клас), “У.Караткевіч.Зямля пад белымі крыламі” (VIII клас) і іншыя садзейнічаюць выхаванню ў навучэнцаў гатоўнасці актыўна ўдзельнічаць у ствральным працэсе на карысць Радзімы, быць адданым інтарэсам сваёй дзяржавы. Вядома, што гісторыю свайго краю павінен ведаць кожны яе грамадзянін. Таму ствараю на ўроках ўмовы, якія садзейнічаюць выхаванню свядомага чалавека-гуманіста, адказнага грамадзяніна, які ведае і паважае гісторыю і культуру свайго народа.

Адна з галоўных ідэй беларускай літаратуры — ідэя патрыятычная. А разам з патрыятызмам выяўляюцца ў беларускай літаратуры яе народнасць, гуманізм. Вытокі гэтых якасцей – у гісторыі народа, у жыццёвым шляху пісьменнікаў – верных сыноў народа. Адсюль вынікае выхаваўчае значэнне тых урокаў, на якіх школьнікі знаёмяцца з творчымі біяграфіямі пісьменнікаў.

Каб зразумець вытокі высокай маральнасці, сканцэнтраваныя ў творах літаратуры, школьнікі павінны ў працэсе вывучэння жыццёвага і творчага шляху пісьменнікаў прасачыць за тым, як фарміраваўся іх светапогляд. Такі падыход адкрывае шырокія магчымасці для выхавання вучняў на біяграфічным матэрыяле. Задумваючыся над пытаннямі: чаму Багушэвіча называлі сялянскім адвакатам, чаму Алаіза Пашкевіч, дзяўчына з заможнай сялянскай сям’і, пайшла ў рэвалюцыю, чаму Іван Луцэвіч і Канстанцін

Міцкевіч сталі народнымі паэтамі Янкам Купалам і Якубам Коласам, чаму з кожнай старонкі кніг Кузьмы Чорнага глядзіць на нас, гаворыць з намі мілая яго сэрцу Случчына, – школьнікі ўбачаць, якую ролю адыграў у станаўленні іх светапогляду народ, дакрануцца да народнай дабрыні, адчуюць душэўную шчодрасць і таленавітасць працоўных людзей, сярод якіх вырастала і фарміравалася асоба пісьменніка.

Існуе даволі багаты арсенал форм і прыёмаў работы з біяграфічным матэрыялам. Галоўнае месца тут часцей за ўсё адводзіцца лекцыі, у часе якой дэманструецца адпаведная нагляднасць, праслухоўваюцца творы пісьменніка. Пашыраны біяграфічныя ўрокі і ў форме гутаркі па папярэдне прачытаных вучнямі раздзелах падручніка і мемуарных матэрыялах. У такую гутарку, апрача адказаў класа на пытанні настаўніка, уключаюцца самастойна падрыхтаваныя невялікія паведамленні вучняў пра асобныя этапы жыцця пісьменніка і кароткія каментарыі да партрэтаў, карцін на біяграфічную тэму, ролі больш значных выданняў твораў.

У апошні час беларусы губляюць інтарэс да сваёй літаратуры. У эпоху сучаснага імклівага развіцця інфармацыйных тэхналогій адных толькі кніг, прысвечаных гісторыі беларускай літаратуры, жыццю і творчасці пісьменнікаў, не дастаткова для абуджэння ў моладзі цікавасці да вывучэння літаратуры. З гэтай нагоды прыярытэтным крокам для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках літаратуры з’яўляецца выкарыстанне сучасных тэхналогій, у тым ліку інфармацыйных. На жаль, рынак не багаты на электронныя падручнікі па беларускай літаратуры, хаця ў сетцы Internet “раскіданы” розныя звесткі пра таго ці іншага паэта, пісьменніка, драматурга, можна знайсці творы мастакоў слова розных эпох. Таму і наспела ўжо неабходнасць аб’яднаць і сістэматызаваць гэтыя матэрыялы. І чаму ж не зрабіць гэта тым, хто не ўяўляе сённяшні дзень без камп’ютара – нашым вучням?

Настаўнік беларускай літаратуры цяпер можа выкарыстаць Інтэрнэт як дапаможны сродак на занятках па вывучэнні жыццёвага шляху

пісьменніка. На сённяшні дзень існуюць сайты, прысвечаныя беларускім пісьменнікам, сайты літаратурных музеяў, паэтычныя старонкі. Пры вывучэнні жыццёвага шляху пісьменнікаў імі можна пакарыстацца.

Я хачу сказаць, якой бы мэтанакіраванай, сістэмнай не была праца настаўніка па гэтай праблеме, дастаткова аб'ёмны праграмны матэрыял і абмежаваная колькасць гадзін урокаў па літаратуры не даюць той магчымасці, каб вучань актыўна развіваўся, духоўна ўзбагачаўся, мог праявіць творчасць, самастойнасць, мог вызначыць у сваім жыцці каштоўныя арыенціры. Таму нельга замыкацца ў рамкі ўрока, патрэбна дзейнічаць шырэй і глыбей і абавязкова з урока літаратуры мець выхад на пазакласную працу. Я разам са вучнямі наладжваем святы, праводзім гасцёўні, вечарыны, конкурсы, віктарыны, гульні. Ужо традыцыяй у нашай школе стала правядзенне прадметных тыдняў, прысвечаных юбілеям беларускіх пісьменнікаў.

Такая праца з вучнямі дапаможа замацаваць і паглыбіць той аб'ём ведаў, які вызначыны праграмай, а таксама дапоўніць цікавым змястоўным матэрыялам, што пашырыць уяўленне вучняў пра літаратуру, раскрые вучню прыгажосць, мілагучнасць роднага слова, абудзіць цікавасць да багатай літаратурнай спадчыны, будзе выхоўваць пачуццё павагі і любові да Радзімы.

Спіс літаратуры:

1. Барчук, А.Л., Грудзінскі, Л.М Грамадзянскае выхаванне школьнікаў - Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2004.
2. Жуковіч, М.В. Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры - Мінск: Аверсэв, 2007.